Рассказывает А. Идель. «В недалеком прошлом у нас работало 339 рабочих-строителей. Осваивали в год свыше шести миллионов рублей не имея техники, помещений, материалов. Но кому-то наша деятельность пришлась не по душе. И пошли допросы, проверки, штрафы, кляузы. По три месяца наши работники оставались без зарплаты. Много плохого сделала нам начальник областного управления жилсоцбанка З. П. Алексеева, обвинив кооператив в хищении 452 тысяч рублей. Девять месяцев в 1990 году мы доказывали, что не верблюды. Кооператив понес убытки в сумме 4 миллиона рублей в результате этого, думаю, запланированного кем-то, наступления на нас, и видимо, не только, ибо около сотни строительных кооперативов вынуждены были прекратить свою работу. Мы удержались, но теперь коллектив состоит из 65 строителей.

А благотворительность... Если бы государство повернулось лицом к предпринимателям, мы бы смогли закрыть любую тяжелую социальную проблему».

Кажется, нет смысла добавлять ко всему изложенному авторские комментарии.

П. СИНЯВСКИЙ.





«КАК НАПИСАНО: НЕТ ПРАВЕДНОГО НИ ОДНОГО.» Римлянам 3:10.

ДЫШЛО...

этого разговора мы получили письмо горисполкома».

Потом последовала... акция дарения кооперативной квартиры Б. Черняк в пользу В. Чалова. Факт необыкновенный, так как родства между этими гражданами до этого не замечалось.

Приведу еще пример усердия В. Лапинского. Он пишет письмо в три адреса (В. Чалову, исполкому Совета Первомайского района и ЖСК-90), в котором сообщает: «... что в соответствии с постановлением Совета Министров БССР от 6 июля 1989 г. Вам разрешено приобретение в личную собственность квартиры № 25 по ул. Репина, 10».

В этом документе правительство разъясняет порядок продажи всем гражданам государственного и общественного жилищного фонда. Однако опять-таки льготных обстоятельств для В. Чалова в нем не предусмотрено. Тогда зачем понадобился этот документ? Для важности, для придания В. Лапинским веса собственному циркуляру?

В итоге директор мехового комбината ордер на кооперативную квартиру получил без задержки. Это подчеркиваю, потому что недавно столкнулся с другим случаем. Участники Великой Отечественной войны Е. Жданов и его жена, несмотря на принятое решение горисполкома, по которому им предоставлена двухкомнатная квартира, не могут получить на нее ордер. Начальник жилищного управления горисполкома В. Сазон отказал в выдаче ордера. И теперь Ждановы вынуждены обращаться в прокуратуру области.

У административных работников в связи с незаконными действиями властей хлопот хватает. В частности, прокуратура направила протест в ЖСК-90, в котором указала, что решение общего собрания кооператива по приему в члены ЖСК гражданина В. Чалова не соответствует требованиям Закона и подлежит отмене.

А тем временем В. Чалов, пока суд да дело, активно вкладывает деньги в ремонт квартиры.

Больше волнует другое. Если первый заместитель председателя в угоду сильным мира сего не соблюдает законодательство, то это уже действительно вакуум власти. Что ему прокуратура? И в этом случае не нам ли, избирателям, надо помочь правоохранительным органам, с которыми еще связывают люди надежду на справедливость? Ведь общественность, народные депутаты могут и должны потребовать освобождения с должности любого скомпрометировавшего себя несоблюдением законов чиновника.

Б. ХАМАЙДА.













ЖИЗНЬ ВСЕ ТА ЖЕ, ДА НЕ ТА

Проходя по Комсомольской улице, я расспрашиваю горожан о Центре милосердия, а в ответ—недоумение... А центр существует уж третий год.

В маленькой комнате, где висит традиционно расшитый гобелен с ленинским ликом, собираются на чаепитие человек двадцать пять стариков и старушек.

Еще их кормят в столовой. Прежде в диетической, но там питание гадкое, а теперь—завода «Химпласт». Еще картошкой снабдили за полцены. Еще распределили гуманитарную помощь германскую. Теперь в центре немецкое молоко ждут. А потом уж, когда помещение очистится, проведут очередное мероприятие—«огонек» девятый, куда пригласят отца Николая.

Еще в профилактории направляют—и одиноким старикам это вполне по душе: там они перезнакомятся друг с другом, и станут адреса в центре выспрашивать. Такие вот незатейливые дела...

А часа в два ночи встречаю человека у мусорных бачков...

—Извините,—спрашиваю,—что вы тут, не плохо ли вам?

—Хорошо все. Старушка моя померла, а я смотрю: бутылку пустую найду или еще чего. Ничего, жить можно...

А еще думаю: жив ли теперь один старичок, что почти не передвигался и веревочки приспособил, чтобы себе подавать?..

В центре полагают, что бывшие товарищи из райкома партии люди отзывчивые и по-коммунистически добрые. Как-никак, а на счету 75 тысяч рублей от предприятий. Кто еще проявить может милосердие по-советски?

—А как чувствуете,—спрашиваю у молодой женщины, медсестры,—с хлебом хорошо будет?

—Еще не голод,—объясняет,—капусту можно есть...

—Вы же,—говорю,—голода не знаете.

—Так читала, фильмы смотрела...

—Да разве там правду узнаешь?

—А разве вы правду напишете?

—Не знаю,—говорю,—но газета у нас демократическая. А что за перебои с хлебом?

—Кто не знает—говорят же, что мафия...

—А есть она в Витебске?

—Наверное, есть.

—А где, как вы думаете?

—Не внизу же...

Такой вот и разговор незатейливый. Да собеседница моя, видать, человек совестливый, добрый.

И не удерживаюсь я, чтобы не посетовать: вот ведь человек—всегда и во всем человек. И так свыкся с нищенством, что смирился, что даже горд—и право «по-советски» защитить умеет до последнего.

...В «Красный Крест» новая медсестра пришла. Ей по обездоленным ходить—у самой сапоги шиты-перешиты. Привыкнем и к такому?

Г. КАТЕРИНИН.











СЛОВА НЕ ВЕРАБЕЙ...

Я лічу, што ўвядзенне свабодных цэн, іх лібералізацыя ў нашых умовах азначае неабмежаваны, дзікі скачок інфляцыі. Наш урад не пойдзе на гэта.

— Урад у поўнай меры ўсведамляе тое, што насельніцтва рэспублікі больш за ўсё хвалюе будучая лібералізацыя цэн. Іх вызваленне і ўвядзенне так званых рыначных цэн у суммежных рэгіёнах непазбежна прымусіць пайсці на гэты крок і нас.

Гэтыя радкі ўзяты з «Заявы Урада Рэспублікі Беларусь» і артыкула, у загаловак якога былі ўзяты словы В. Кебіча «На лібералізацыю цэн урад не пойдзе». Яскравая ілюстрацыя адсутнасці сваёй пазіцыі ў Кебіча пры вырашэнні складанейшых пытанняў жыцця, ці не так?

Роздум пасля заявы Урада

ЗНОЎ АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ

Паўгода ўжо спрабую смак фермерскага хлеба. І чытаю ў друку аб эканамічнай няроўнапраўнасці так званых грамадскіх і фермерскіх гаспадарак.

З надзеяй на перамены да лепшага ўглядваўся я ў радкі Заявы Урада Рэспублікі Беларусь ад 18 лістапада г. г. «Хворае пытанне—прыватызацыя», «Ключавое пытанне —аб зямлі», «Трэба прызнаць, што слаба ўкараняюць прагрэсіўныя эканамічныя метады гаспадарання», «...майстроў стварэння не так многа, як хацелася б». Мяркую, гэтых цытат дастаткова, каб скласці ўражанне аб пазіцыі Урада.

Ды разуменне складанасці сітуацыі, думаецца, яшчэ не падстава, каб гарантаваць Ураду, «што ні голаду, ні холаду на Беларусі не будзе». Патрэбны канкрэтныя захады.

Так, у заяве гаворыцца, што да 1 сакавіка ўсім жадаючым грамадзянам рэспублікі для вядзення фермерскай гаспадаркі будуць выдзелены зямельныя ўчасткі да 50 гектараў. Вялікае дзякуй! Мне для трусафермы ўпаўне дастаткова маіх 0,5 гектара. Адно трэба, каб гэтыя паўгектара былі сапраўды маімі, прыватнымі. Да таго ж, як ні ўчытваўся я, ды ні радка не знайшоў аб тэхнічным забеспячэнні фермера.

Ні нашымі Законамі, ні мясцовымі ўладамі не забараняецца фермеру карыстацца тэхнікай, коньмі калгасаў і саўгасаў. Аднак без «зладзейкі з наклейкай» ні трактара, ні каня ў прыпар на свой агарод не дапросішся.

Такім чынам, «вадкіх грошай» на сённяшні дзень не маю, а «драўляныя рублі»—не кацірующа.

Да слова трэба дадаць, што і даходы фермера параўнальна нязначныя. Бо яму за прадукцыю ніхто не даплочвае аніякіх кампенсацыйных. Хаця, як гаворыцца ў Заяве, толькі летам гэтага года Урад выдзеліў аж 3 мільярды рублёў прадпрыемствам аграпрамысловага комплексу і сялянскім (фермерскім) гаспадаркам на кампенсацыю дадатковых выдаткаў. Я, у прыватнасці, не ведаю ніводнага фермера, які б пакарыстаўся нейкай тысячаю рублёў з тых мільярдаў.

З заявы вынікае, што і надалей адносіны да фермера не зменяцца. Самае хворае, самае ключавое пытанне ў фермерскай дзейнасці—адсутнасць партнёраў па матэрыяльнаму забеспячэнню, збыту прадукцыі. З новага года ўводзяцца купоны. Частку зарплаты або ўсю купонамі і грашыма будуць атрымліваць працаўнікі прадпрыемстваў, калгасаў. А фермеры, кааператывы дзе павінны браць тыя купоны, каб набыць неабходныя тавары для вядзення гаспадаркі, не кажучы ўжо пра яе пашырэнне?

У Заяве гаворыцца і пра тое, што на ўвядзенне ўласнай валюты рэспубліка можа пайсці яшчэ не хутка, толькі пасля прыняцця пагадненняў аб банкаўскім саюзе з членамі Эканамічнага Супольніцтва. Між тым, «драўляныя рублі» працягваюць навадняць рэспубліканскі рынак. Загароды на граніцах, талоны, купоны —гэта паўмеры. Свае грошы, свае цэны—вось атрыбуты нашага эканамічнага суверэнітэту.

У Заяве прагучала цікавае прызнанне аб прапанове Урадам апазіцыі міністэрскіх партфеляў. Далі Бог, калі б лідэру парламенцкай апазіцыі Зянону Пазняку быў прапанаваны пост нават не намесніка Прэм'ера, а міністра фінансаў з мэтай увядзення рэспубліканскай валюты, думаю, што ён не адмовіўся б. А пакуль... Пакуль Урад на чале з В. Кебічам працягвае рухацца па наезджаных рэйках таталітарнай эканомікі. І тут пры ўсім жаданні не атрымаецца супрацоўніцтва ні між Урадам і БНФ, ні між сучаснай адміністрацыяй і нараджаючымся класам беларускіх фермераў.

У заключнай частцы Заявы гаворыцца аб устанаўленні дружалюбных адносін з суседнімі дзяржавамі і нават з Бангладэш, Тунісам. Ну ў Туніс я ні бульбу, ні трусоў прадаваць не павязу. А вось практычна дагавор на пастаўку сваёй прадукцыі ў суседнія з Полацкім раёны Літвы, Латвіі ці Смаленшчыны чаму б не заключыць з пэўнымі спажыўцамі? Прадукцыя ж мая! Ды не хутка, мусіць, фермер сваю прадукцыю, а наёмны работнік сваю працу будзе прадаваць па той цане, якая б садзейнічала пашыранаму ўзнаўленню прадукцыйных сіл.

Уся бяда, па-мойму, нашых афіцыйных лідэраў савецкага грамадства, пачынаючы з Кастрычніцкага перавароту, у тым, што імкнемся аснову асноў—эканоміку—будаваць на голым энтузіязме і... дзяльбе-перадзяльбе.

Каб я мог стварыць фермерскую гаспадарку, мне патрэбны: уласная зямля, прыватны гандаль усімі вытворчымі сродкамі, устойлівая грашовая адзінка, магчымасць прадаваць прадукцыю па выгаднай цане, прытым, любому пакупніку.

Павел НЕСЦЯРОНАК,
пачынаючы фермер.

Полацкі раён, в. Канстанцінава.

Ці даканаюць нас андрээвы?

(Суд павінен адбыцца над ідэалогіяй КПСС, а не над камуністамі)

Можна было б неяк моўчкі перацярпець, калі б напад Андрэевых завяршыўся неабальшавіцкім з'ездам у Менску на чале з іх Нінаю. Можна было б абмежавацца раённаю прэсаю, калі ў лепельскае газэце «Ленінскі сцяг» зьявіўся артыкул члена КПСС з 30-гадовым стажам В. Андрэева пад назовам «Я—за партыю камуністаў». (Што я і зрабіў, зьмясціўшы там жа адказ «А я—супраць партыі камуністаў»). Зьвярнуцца ж да больш цэнтральнага выданьня мяне прымусіў той жа «Ленінскі сцяг», які ласкава прадаставіў месца артыкулу «Кампартыя павінна жыць», бо зьляпаў яго ўжо ветэран вайны і працы... У. Андрэеў. Гэта ўжо нейкі фаталізм, злы рок, разварушэньне асінага гнязда. Трэба тэрмінова ратаваць Беларусь ад такіх неаандрэевых.

Першы лепельскі Андрэй сьцьвярджае, што ўсе чорныя справы ў краіне тварыла купка партапаратчыкаў, а асноўныя масы партыі былі заўсёды наперадзе ў самых цяжкіх справах. Давайце ж разьбярэмся, ці так гэта. Хто раскулачваў працавітае сялянства? Вядома, па загаду зьверху. Аднак, ці не тыя ж перадавыя шараговыя камуністы з наганамі разбуралі хутары? Хто выграбаў хлеб у сялян да апошняга зярняці? Хто пускаў кулі ў лоб мільёнам савецкіх будаўнікоў камунізму пад час сталінскіх рэпрэсіяў? Хто стаяў зь бізуном ды карабінам над будаўнікамі Беламорканалу, Нарыльску, лесанарыхтоўшчыкамі ў ГУЛагах? Хто расстрэльваў сваіх чырвонаармейцаў на перадавой пад час адступленьня, седзячы ў акопах загараджальных батальёнаў? Хто з захапленьнем пляскаў у ладкі 19 жніўня гэтага году, што ўсе бачылі? Няўжо гэта ўсё рабіла толькі купка партыйнае эліты?

Цяпер пара «паляваньня на ведзьмаў». Гэты тэрмін апошнім часам запаланіў лексікон былых партапаратчыкаў. Менавіта яны з самых розных трыбунаў крычаць, што пачнецца або ўжо пачалося «паляваньне» на шараговых камуністаў, баючыся, каб не прыцягнулі да адказнасьці. Іх саміх.

В. Андрэеў не называе ні воднага шараговага камуніста, якога хаця б на словах дыскрымінавалі. Бо такіх няма. Не называе ён і ні воднага былога партыйнага кіраўніка, якога ўшчамілі б у правох. Бо ўсе яны з райкомаў паперасоквалі на іншыя кіруючыя пасады зь няменшымі акладамі.

Дык дзе ж тады андрэеўскае «паляваньне»? Выходзіць, ён дэмагог, а ня тыя, хто «крычыць» на мітынгах. Яшчэ і таму, што сьцьвярджае, быццам на мітынгах «патрабуюць расправы над усімі камуністамі». Адразу бачна, што ні на водным мітынгу Андрэеў ня быў. А шараговыя камуністы сапраўды вінаватыя ў тым, што на сваіх плячох утрымлівалі злачынны партапарат, былі яго донарамі. Але няхай за гэтую віну нясуць адказнасьць перад сваім сумленьнем.

Не аргумент у Андрэева, што вольна дзейнічаюць камуністычныя партыі ў ЗША, Нямеччыне, Францыі. Там яны ніколі не былі кіруючымі монстрамі, дзяржаўнымі структурамі. І толькі менавіта таму не нанесьлі ніякія шкоды грамадзтву. У нас жа камуністычнае панаваньне ня толькі шкоду нанесла, яно яго разбурыла! І таму я супраць усялякага прадастаўленьня камуністам магчымасьці самавызначыцца. Як фашызм, камунізм таксама патрабуе свайго Нюрнбергу. Яшчэ раз паўтару, суд павінен адбыцца над ідэалогіяю, якая нанесла шкоду, а не над камуністамі.

Двайнік жа В. Андрэева—У. Андрэеў яшчэ больш у веданні гісторыі прафан. Мяркуйце самі. Андрэеў-ІІ сьцвярджае, што «жорсткасьці камуністаў пад час калектывізацыі і знішчэння хутароў» ня што іншае, як байкі. А заградбатальёны франтавікі «і ў вочы не бачылі». Чаму ж тады аб іх распавядаюць іншыя? На якім тады фронце служыў Андрэеў-ІІ?

Ужо зусім хочацца ванітаваць ад пераканаsuccesses...

Ніхто ня ўзьвінчваў так гонку ўзбраеньняў, як Краіна Саветаў. Усё НАТА не магло за намі ўгнацца. Увесь Сьвет узброілі. Доказы? Калі ласка! Зусім нядаўна брынчэў савецкаю зброяю Хусейн. Дагэтуль ад яе ня могуць пазбавіцца немцы. З Кубы ня можам самі яе забраць. І ў Югаславіі яна страляе...

Няўжо ўсяго гэтага ня ведае Андрэеў-ІІ? Гістарычная прафанацыя ці палітычная блізарукасць вадзіла яго рукою? Але, што б там ні было, адно існаванне лепельскіх Андрэевых прымушае грамадзкасьць рэспублікі задумацца.

ВАЛАДАР ШУШКЕВІЧ,
член Вышняй Рады Нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі.

ЛЕПЕЛЬ.









ЯК НАЧАЛЬСТВУ—АДРАЗУ І ФОНД...

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

малі раней, чым аблвыканком **«зацвердзіў новы парадак рэалізацыі, якім абмежаваў прыняцце гаррайвыканкомамі рашэнняў аб персанальным выдзяленні аўтамабіляў грамадзянам за асобыя заслугі, выкарыстоўваючы для гэтых мэт не больш пяці працэнтаў гадавога фонду».**

Цікава, хто трапіць у пяць працэнтаў з асобымі заслугамі? Можа зноў з гэтае кагорты?

І яшчэ—адказваў У. Цацоха: **«Аблвыканком неаднаразова прапаноўваў ураду рэспублікі не размяркоўваць рынечныя фонды аўтамабіляў міністэрствам і ведамствам. Аднак і ў гэтым годзе значная колькасць машын была выдзелена тым жа шляхам».**

Тут варта задумацца. Ці не настаў час рэарганізоўваць структуры аблвыканкома ды і Саўміна заадно? Не праглядаецца ж, шаноўныя, узаемасувязі, узаемадзеяння між вамі. Адсюль і парушэнне розных «Правіл».

НАШ КАР

Пісьмы чытачой

З'яўленне—своечасовае

Паважаная рэдакцыя газеты «Выбар»!

Нядаўна купіў у кіёску Вашу газету. Вельмі рады яе з'яўленню. Можа яна хоць нейкім чынам дапаможа пазбавіцца некаторай частцы насельніцтва ад камуністычнага дурману. Лічу, што газета з'явілася своечасова і зможа запоўніць прабелы ў інфармацыі, паколькі тэлебачанне ды і прэса засталіся ў руках пракамуністычнай наменклатуры.

У былой камуністычнай газеце вобласці можна толькі чытаць аб настальгічнай тузе па «маналітнаму адзінству», ды аб стварэнні пенсіянерамі ды партапаратчыкамі ініцыятыўнага камітэту па аднаўленню дзейнасці КПБ. Яны нібы не ведаюць, што аб гэтай народа-абарончай дзейнасці гаворыць пракурор Рэспублікі Беларусь.

Я многа разоў бываў у Прыбалтыцы, дзе не могуць ніяк зразумець аднаго: чаму я, беларус, не ведаю сваёй роднай мовы? Многія нават не вераць, што існуюць нейкія без'языкія беларусы. Такое да іх не можа ніяк дайсці. Таму жадаў бы, каб на старонках вашай газеты можна было пачытаць аб нацыянальным адраджэнні, аб культуры і мове, якую знішчылі бальшавікі, і якія па фарысейску на рускай мове сёння заклікаюць вяртацца да народных каранёў.

А. АЛЯКСАНДР.

(у перакладзе з рускай мовы).

МАНАЛОГІ ПАСЛЯ АТЭСТАЦЫІ

Слова з крыжа маўчання

У калектыве Бешанковіцкай СШ № 1 мяне папярэджвалі: «падыме крык». Але мой абавязак выслухаць і другі бок. Я зайшла ў сумежны з настаўніцкай кабінет дырэктара М. Ф. Белавуса. Тым больш, ён запрасіў сам, патрабаваў прадставіцца. Я паклала незавіднае, без залатога ціснення, часовае пасведчанне на стол. Рэдактар газеты «Выбар» дэмакратычных плыняў Прыдзвінска-Прыдняпроўскага краю. Раздражнёнасць, да якой прызвычаіліся многія, вырвалася адразу, як толькі задала пытанне: што ў вас адбылося з атэстацыяй? «З якой атэстацыяй?»—ускіпеў дырэктар, быццам ніколі і не чуў, якія атэстацыі ў школах толькі што прайшлі паўсюдна. З той самай, адказала, якая выклікала незадаволенасць і абурэнне ў настаўнікаў. «Якое абурэнне, у каго?»—яшчэ больш узвысіўся голас.

Але я не дзяўчынка-школьніца, каб са мной гаварылі вось так. Аб гэтым, у прысутнасці яшчэ дзвюх жанчын, адна, кажуць, была інспектар, я выказалася дырэктару і пакінула яго кабінет. Засталося адно: яшчэ больш паверыць настаўнікам, бо яны, запалоханыя і прыніжаныя, рашылі больш не маўчаць.

«Былы райкомаўскі работнік. Перанёс усю сістэму адміністрацыйнага дыктату на школу. Каб трапіць пад яго ўціск, дастаткова нязначнай, нават ускоснай заўвагі, нязначнай нязгоды»—такая асноўная характарыстыка, якую далі ў калектыве свайму дырэктару.

Але не будзем галаслоўнымі. Бо ў маім блакноце, не з пальца ж я іх выссала, засталіся прозвішчы настаўнікаў, асабліва настаўніц, якія нават плакалі перада мной, калі расказвалі аб сваіх прыніжэннях і знявагах. Яны прасілі напісаць аб гэтым і ў «Настаўніцкую газету».

Аб чым жа гавораць маналогі?

Г. С. ШКІР'ЯНАВА:—Аднойчы на закрытым партыйным сходзе ў прысутнасці работніка райкома партыі зрабіла дырэктару заўвагу, што нельга паводзіць сябе так нетактоўна ў педкалектыве. Масла ў агонь падліло і тое, што яшчэ вясной выйшла з партыі. Усё хацеў «паглядзець у вочы».

У даволі настойлівай форме «прасіў» настаўнікаў і вучняў (сам абходзіў класы) выйсці 7 лістапада на мітынг да помніка Леніна. Праз тыдзень ужо цікавіўся: ці была. А навошта?Гэта ж—права кожнага. Маю заяву на пераатэстацыю, я спачатку выйшла на камісію па працоўных спрэчках, груба адхіліў.

У. Я. НОВІКАЎ:—Наша камісія па працоўных спрэчках, я яе старшыня, 26.10.91 разгледзела заяву Г. С. Шкір'янавай. Прысваенне па суб'ектыўнаму падыходу ёй II катэгорыі было яўна заніжаным. Адпаведна закона аб парадку вырашэння індывідуальных працоўных спрэчак, уведзенага ў дзеянне з 1.06.91, камісія разглядае працоўныя спрэчкі ў прысутнасці адміністрацыі. Аднак на мае просьбы прыбыць на камісію ні дырэктар, ні завуч Раіса Міхайлаўна (запрашалі два разы) не адгукнуліся.

Тым не менш, мы выйшлі з прапановай пераатэставаць Г. С. Шкір'янаву. Заяву ён груба адшпурнуў. Але ж такім чынам пераатэстоўвалася Н. В. Варахобка і іншыя.

Атэстацыя настаўнікаў напачатку не выклікала масавага абурэння і крыўды, хоць не было ўліку ўсіх фактараў: прафесійных, чалавечых, стажу работы, перадпенсійнага ўзросту. Але, калі кіраўнікам школы, у якіх стаж не вельмі вялікі, ды і не было адкрытых мерапрыемстваў, наведвання ўрокаў, была прысвоена вышэйшая катэгорыя, гэта ўзрушыла ўвесь калектыў.

Адпаведна арт. 34 Закона аб адукацыі настаўнік мае права на абарону чалавечай і прафесійнай годнасці. У нас жа гэта немагчыма, паколькі працвітаюць самаўпраўства, запалоханасць... Прафсаюз жа сваёй функцыі абароны не выконвае.

Сказана ў Законе аб адукацыі і аб неабходнасці ўстрымлівацца ад выкарыстання свайго службовага становішча ў палітычных мэтах... Аднак ідэя дырэктара «не падвесці школу і абавязкова выйсці да помніка Леніна 7 лістапада» прыгнечвала педагогаў і вучняў. Чамусьці ў раёне да Кастрычніка прыўрочылі Дзяды. Настаўнікі вельмі настойліва «запрашаліся». (Магчыма, памінаць вечна жывога Ільіча—Я. М.).

М. В. ДОМКІН:—Катэгорыі не атрымаў ніякай. Працую дзевяць год. Заўваг не было. Праз некаторы час сказалі, каб напісаў заяву на пераатэстацыю. Але не стаў. Навошта прыніжацца, калі так аплявалі. Потым жа завочна пераатэставалі самі, далі II катэгорыю, як і настаўніцы С. В. Бурнейка.

В. В. Ягорава ўзнагароджана медалём, але не ўлічылі нічога. М. М. Аўчыннікаў быў інспектарам па матэматыцы, стаж 25 гадоў, і толькі II катэгорыя, як і ў біёлага Л. А. Касінец.

А. І. ФРАЛОЎ:—Былі спрэчкі наконт 7 лістапада. Дзеці скардзіліся, што дырэктар напамінаў, маўляў, не забывайце, што вам тут яшчэ вучыцца.

І. П. АНДРЭЕВА, член камісіі:—Камісію па атэстацыі дырэктар назначыў 31 жніўня, тэрмін, устаноўлены ў РАНА да 7 верасня быў малы, потым прадоўжылі да 10-га. Камісія была ўведзена ў заблуджэнне, акрамя характарыстык, якія рыхтавалі летам, поўных і ўсебаковых крытэрыяў па атэстацыі настаўніка не было. Дапаўненні прыйшлі пазней. Уся сістэма была не адпрацавана.

С. Л. САЛОХА, член камісіі:—Думалася, ацэньваем справядліва ў адпаведнасці з нарматыўным пісьмом. Потым прыйшло другое, але мы яго не паглядзелі. Не прапрацавалі як след. У дырэктара былі толькі запісы ў сшытку, па якіх і вялі ацэнку. Знаёміліся з імі ў час атэстацыі. Інструктаж папярэдні адсутнічаў.

Т. М. КАГАЛЁНАК:—Як можна было не даць першую катэгорыю матэматыку Аўчыннікаву? Столькі адпрацаваў... І ў Домкіна, настаўніка працы, залатыя рукі. Трэба пераглядзець усё ў калектыве, стаць на яго абарону. (Падаю ў скарачэнні, бо настаўніца, гатовая абараняць, гатова і адмовіцца ад сваіх слоў, каб не было «пасквіля» на адміністрацыю—Я. М.).

Л. В. ГАЙНЕТДЗІНАВА:—Я тут новы чалавек. Працавала раней у райкоме. Такой нездаровай атмасферы, мусіць, няма нідзе. Усё залежыць, як паставіцца да цябе дырэктар. На катэгорыю я і не прэтэндую.

Г. В. МАРТЫНЕНКА:—У нас вышэй тэхнічка цэніцца. Напляваце льскія адносіны асабліва да нас, настаўнікаў замежных моў. Ні з маім здароўем пасля складанай аперацыі, ні з чым іншым дырэктар не лічыцца. Трапіла ў няміласць, калі выказала, што прафсаюз знаходзіцца пад крылом адміністрацыі. І яшчэ, калі па стану здароўя праз РАНА прыйшлося адмаўляцца ад класнага кіраўніцтва. Не магу спакойна пераносіць, калі побач разумнаму чалавеку вокрыкам закрываюць рот. Як ён можа так: «Сядзь Новікаў, сядзь іншы»...

Хацелі правесці прафсаюзны сход па атэстацыі, сарваў аб'яву. Лічу катэгарычна, што дырэктар не мае маральнага права характарызаваць мяне. Ні з мінусам вялікім, ні з плюсам. Я на педрабоце 23 гады. (Настаўніца плакала—Я. М.).

М. М. АЎЧЫННІКАЎ:—Плюнулі ў душу. Ва ўсім суб'ектыўны падыход. Цяпер ні на якую замену не пайду. Не маю права, у мяне за 25 гадоў сумленнай працы II катэгорыя. Гэта не тое, што іншым: за 10 і—вышэйшая. Сказана мне: ты ніколі не атрымаеш...

Ад карэспандэнта:—Мне расказалі, як, прыніжаючы Л. С. Букштынаву, пасылаў яе былы сакурснік па фізкультурнаму тэхнікуму збегаць туды-сюды, пазваць каго. Як дырэктару была зроблена заўвага, каб не крычаў «абарзелі», які канфлікт адбыўся, калі ў час канікулаў настаўніца ездзіла ў Ленінград, як казаў пра яе: «куды ёй пераатэстоўвацца, яна ж нагі не ўздыме».

Гады, зразумела, бяруць сваё. Але навошта ж так забіваць апошнюю веру ў жанчыны, якая 25 год стаяла ў чарзе на кватэру, якую сёння няма чым абставіць? Узрост, стаж таксама павінны былі ўлічвацца.

Задумайцеся, шаноўныя педагогі, каму патрэбна такая (ды і ўвогуле) атэстацыя, якая ўзняла сцяну варожасці ў вашым калектыве? Не плачцеся перад журналістам, адмаўляючыся ад свайго прозвішча толькі што назваўшы яго. Я і так многае апусціла, нейтралізавала. Але, калі вы не можаце пастаяць за сябе, калі вас так запалохалі, то, мусіць, вы дастойныя гэтага. Некаторыя гатовыя адмовіцца ад таго, што гаварылі ў прысутнасці іншых. Бог з вамі: вам жа глядзець адзін аднаму ў вочы.

Як стала вядома, дырэктар выклікаў вас (бывае, выклікаюць нават міліцыю) па аднаму. Цікавіўся маім прозвішчам і мной, хаця я паказвала дакументы. Не ведаю, навошта, але, як і вы, здагадваюся, хоць я не асуджаю ні вас, ні адміністрацыю, я толькі канстатую факт у вашым асвятленні.

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ.



*Матфея 25:41.



"И ПОЙДУТ СИИ В МУКУ ВЕЧНУЮ, А ПРАВЕДНИКИ В ЖИЗНЬ ВЕЧНУЮ." Матфея 25:46.



"И КТО НЕ БЫЛ ЗАПИСАН В КНИГЕ ЖИЗНИ, ТОТ БЫЛ БРОШЕН В ОЗЕРО ОГНЕННОЕ." Откр. 20:15.

Судьба тех, кем гордимся

А ДОЛЛАРЫ ЯНОВСКОГО ЗАБИРАЕТ МОСКВА

Вполне вероятно, что однажды бледному юноше со взором горящим придет в голову сумасбродная идея стать олимпийским чемпионом по боксу. Как Вячеслав Яновский. И разумеется, он поспешит в известный в Союзе витебский спортклуб «Мужество», в котором усилиями Заслуженного тренера СССР Валерия Георгиевича Кондратенко в свое время появились такие корифеи ринга, как Юлий Прохоров, Владимир Масюк, Вячеслав Яновский, а сегодня подают большие надежды мастера спорта Владимир Комаров, Сергей Быковский, Игорь Литовка, Дмитрий Росляк.

Но там ему скажут:

—Парень, ты сможешь стать олимпийским чемпионом, но для этого надо уметь шить трусы.

—Я не вижу логической связи между нокаутом, в который я пошлю Джона из штата Колорадо и ножницами портного,—резонно возразит юный витеблянин.

—Мы тоже ее не видим,—ответят профессионалы бокса,—но чтобы сегодня выжить, сапожник должен уметь печь пироги, а...

—Вам предложили самим зарабатывать деньги, которые будете расходовать на воспитание будущего олимпийца,—догадывается парень.

—Умница!—похвалят его мастера крепкого удара в челюсть.—Из тебя получится настоящий виртуоз продевания нитки в иглу. И не думай, что проблему можно решить, содрав с родителей за твое обучение полста рублей. Для них это очень много, для клуба слишком мало.

—Но среди вас есть тренер, который может создать за свой счет десять таких клубов. Он же известен на всю страну, а его ученик зарабатывает сегодня валюту в Японии.

—Парень,—разочарованно скажут профессионалы,—мы ошиблись в твоих способностях глубоко мыслить. К тому же ты нерегулярно читаешь газету «Выбар». Наши тренеры, так же как и специализированной детско-юношеской спортивной школы, очень небогаты.

—Кто же тогда загребает денежки, которых, судя по славе витебского спорта, должно хватать для его развития с избытком? А-а, понял, и здесь шарит рука Москвы! Яновский зарабатывает доллары Госкомспорту СССР, а клуб, который его воспитал, не имеет ни гроша. Но это же воровство!

Конечно, такой разговор может и не состояться, если рынок, в буквальном смысле, заполнит стадион «Динамо», а тренеры бросятся на поиски сырья для малого государственного предприятия, которое открыто при клубе «Мужество» во имя его спасения от финансового краха. Просто негде и не с кем будет вести парню этот разговор.

Чтобы этого не случилось, и ломает сегодня голову председатель спортклуба Марк Моисеевич Гантман: как же быть? За год существования малого предприятия по пошиву спортивной одежды сделали еще одно открытие старой истины: каждый должен заниматься своим делом. Их дело—это обучать около 300 боксеров, которые приходят сюда.

Работники клуба благодарны коллективу завода заточных станков и его директору Евгению Олеговичу Киселеву за ощутимую поддержку. Понимают они и положение, в котором оказался областной совет «Динамо», вынужденный значительно сократить финансирование клуба.

Но средств явно не хватает.

И поговаривают спортсмены вот о чем. Многие белорусские боксеры подписали контракты с Польшей и зарабатывают деньги. Но мы держимся, ни на какие контракты не идем, работаем в этих тяжелых условиях на свой спорт.

Кто же оценит их патриотизм и верность народу?

П. СИНЯВСКИЙ.



На снимке: *В. Г. Кондратенко со своими молодыми питомцами.*

Веселый глобус

—Спасибо вам, доктор, за то, что вы вылечили меня. О чем теперь стоит побеспокоиться?

—Я не знаю, дорогой пациент, какое именно лекарство вас излечило.

* * *

—Доктор сказал, что поставит меня на ноги за неделю.

—И он сделал это?

—Да. Я вынужден был продать свой автомобиль.

* * *

—Послушайте, пациент. Вы кашляете гораздо легче сегодня утром.

—Еще бы, доктор, я практиковался всю ночь.

Телеграмма в номер

ПРАЗДНИК СВЕТА

Начиная со 165 года до нашей эры 25 числа месяца кислев (в 1991 году эта дата приходится на 2 декабря) наши мудрецы установили восьмидневный праздник в память о том, как Маккавеи отвоевали захваченный язычниками Храм. В каждый из восьми вечеров, по традиции, зажигаются огни светильников в честь неиссякаемости веры еврейского народа и его мужества.

Желаем вам, вашим семьям и близким счастья, здоровья, успехов во всех начинаниях. Пусть в ваших домах не гаснут в праздничные дни Ханукальные огни.

Приглашаем на семинары и лекции по еврейской культуре, истории, национальной традиции к иудаизму. Адрес: 113303, Москва-303, а/я 101. Справки по тел. 1-85-03 (Витебск).

Ассоциация гуманистического иудаизма.

Семен АВГУСТЕВИЧ, председатель Совета—кандидат психологических наук.

Следующий номер газеты выйдет 18 декабря 1991 г.

Выбар

УЧРЕДИТЕЛЬ:
Витебский городской клуб избирателей «За демократические выборы».

Главный редактор
Леонид ЦВИКА

Художник, Г. Кликушин.
Фотографии А. Гапонова, М. Михайлова.
Макет номера В. Челнокова.
Временный адрес редакции: 210026, г. Витебск, ул. Маяковского, 1.

Авторы опубликованных материалов несут ответственность за подбор и точность приведенных фактов, цитат, экономико-статистических данных, имен собственных, географических названий и прочих сведений, а также за то, что в материалах не содержится данных, не подлежащих открытой публикации.

Редакция может опубликовать статьи в порядке обсуждения, не разделяя точку зрения автора.

Рукописи не возвращаются и не рецензируются.

Текущий счет редакции № 200700962 в Витебском коммерческом банке («Виткомбанк»). Код (МФО) банка 150801701.

Газета набрана и отпечатана офсетным способом в Витебской укрупненной типографии им. Коминтерна: гор. Витебск, ул. Щербакова-Набережная, 6.

Полиграфисты: **В. Корунас, Л. Волкова, Л. Дроздова, А. Каспорович, Д. Малышев, Б. Платовский, И. Иванов.**

Номер подписан к печати 3.12.91 г. в 17.15.

Зак. 6644 Тираж 2500.

Цена 40 коп.

